УДК 75.046(476)

Галіна Флікоп-Світа

# Прарочы чын уніяцкіх іканастасаў Беларусі: генезіс, праграма, атрыбуцыя захаваных помнікаў

**Пророчий ряд уніатських іконостасів Білорусі: генезис, програма, атрибуція збережених пам'яток**

На основі архівних джерел, зокрема візитацій Володимиро-Брестської, Полоцької та Турово-Пінської єпархій, досліджується історія формування пророчого ярусу в білоруських іконостасах. З'ясовується, якою мірою поява цього ряду в середині – другій половині XVII ст. у храмах василіанських монастирів пов'язана із поширенням уніатства. Висловлюється думка про ймовірне переобладнання інтер'єрів храмів після переходу білоруських єпархій на православ'я і, відповідно, заміну іконостасів. Нові іконостаси нерідко робилися «на швидку руку», для чого використовувалися і старі ікони.

Введено в науковий обіг іконописні пам'ятки пророчого ряду уніатського періоду з Жировицького і Супрасльского іконостасів, а також океремі старозавітні образи старозавітніх пророків і праотців з села Мищіци Жабінковського району Брестської області та з села Даниловичі Вітківський район Гомельської області. Зроблена їх сюжетна характеристика; проведено їх атрибуцію. Звертається увага на традицію зображення в пророчому ряді старозавітних пророків та праотців.

*Ключові слова:* пророчий чин, білоруський іконостас, греко-католицька церква, іконопис, сюжети

**Halina Flikop-Svita**

**The Prophets' row of the Uniate iconostases of Belarus: genesis, story structure, attribution of the preserved artifacts**

On the basis of archival sources, in particular visitations of Volodymyr-Brest, Polotsk and Turov-Pinsk eparchies, history of the formation of Prophets' row in the Belarusian iconostases is researched. It is discovered to what extent the appearance of this row in the mid – second half of the 17th century in churches of Basilian monasteries is related to the spread of uniatism. It is suggested that there was probably renovation of interiors of churches after the transition of the Belarusian dioceses to the Orthodox Church, and therefore replacement of iconostasis was made. New iconostases often were made in haste, and old icons were used too.

The icon-painting artifacts of the Prophets' row of iconostases of Zhyrovichy and Supraśl in uniate period, as well as some Old Testament images of the Old Testament prophets and forefathers from Mishchica village of Zhabinka District (Brest Oblast) and Danylovychi village of Vietka District (Gomel Oblast) are analyzed and introduced into the scientific circulation. Their plot characterization and attribution is done. Attention is drawn to the tradition of representation in the Prophets' row of the Old Testament prophets and forefathers.

*Keywords:* the Prophets' row, Belarusian iconostasis, the Greek Catholic Church, icon painting, plots

Прарочы чын – адзін з ярусаў высокага іканастаса. Упершыню ён быў выкарыстаны ў іканастасе Успенскага Сабора ва Уладзіміры (Расія), над якім у пачатку XV ст. працаваў слынны іканапісец Андрэй Рублёў. Пазней у рускіх іканастасах розных рэгіёнаў паступова ўкараніўся такі ярус, пра што сведчаць захаваныя помнікі канца XV ст. з Ноўгарада, пачатку XVI ст. з Ферапонтавага манастыра [15, с. 190].

Аднак у беларускай сакральнай традыцыі такая з'ява ўзнікла, на нашую думку, значна пазней. А яе пашырэнне прыпала на перыяд існавання Уніі на нашых землях. Таму і паўстае асноўнае пытанне: ці было звязана з'яўленне прарочага чыну ў беларускіх іканастасах з уніяцкай традыцыяй? Ці яно мела месца і раней – у да-ўніяцкі перыяд? У дадзеным артыкуле пры прыцягненні архіўных крыніц мы паспрабуем даць адказы на пастаўленыя пытанні.

Аднак перш чым перайсці непасрэдна да разгляду іканастасаў і абразоў, неабходна сказаць, што прарочы чын беларускіх уніяцкіх іканастасаў у якасці прадмета даследавання айчыннымі (ды і замежнымі) навукоўцамі не абіраўся. Гэта найперш тлумачыцца значнай стратай артэфактаў і зусім невялікай колькасцю захаваных помнікаў, на падставе якіх (без прыцягнення архіўных матэрыялаў) нельга зрабіць абгрунтаваныя высновы. Разам з тым асобныя творы з больш ці менш разгорнутымі анатацыямі рэпрадукаваліся ў альбомах і экспанаваліся на выставах [12, 17, 19]. Таксама пэўныя назіранні адносна прарочага чыну выказваліся даследчыкамі, якія закраналі тэму беларускіх іканастасаў (І. Духан [16], М. Яноха [5], Э. Вецер [13], А. Ярашэвіч [34]).

Нашая цікавасць да гэтага пытання тлумачыцца тым, што, паводле назіранняў, здзейсненых намі на падставе шматлікіх гістарычных крыніц XVIII стст., менавіта трох'ярусныя іканастасы, якія складаліся з мясцовага, апостальскага дэісуса і прарочага ярусаў, ва ўніяцкіх храмах лічыліся поўнымі. Пра гэта, у праватнасці, сведчыць крыніца за 1732–1736 гг. з апісаннямі больш за 120 грэка-каталіцкіх цэркваў Мсціслаўскага афіцыялату Полацкай епархіі [28], пра іканастасы якіх найчасцей гаворыцца, што яны – «поўныя», а ў некаторых выпадках прыводзіцца расшыфроўка гэтага азначэння, адкуль вынікае, што пад «поўным» меўся на ўвазе трох'ярусны іканастас з мясцовым,

дэісусным і прарочым ярусамі [28, арк. 22]. І менавіта гэтая акалічнасць дазваляе паставіць пытанне, калі менавіта сфарміраваўся такі склад?

Адказаць на яго даволі складана. Справа ў тым, што іканастасаў да-ўніяцкага перыяду не захавалася ўвогуле; асобных беларускіх абразоў, якія ствараліся раней за канец XVI – пачатак XVII ст. налічваюцца адзінкі і сярод іх няма выяў Прарокаў. Дакументаў з апісаннямі іканастасаў да-ўніяцкай эпохі таксама вядома вельмі мала. Так, у сваім артыкуле, прысвечаным іканастасам Рэчы Паспалітай, польскі даследчык М. Яноха адзначае, што да канца XVI ст. належаць толькі дзве крыніцы са звесткамі пра беларускія іканастасы: апісанні цэркваў Кобрынскага і Лешчынскага манастыроў. У абодвух выпадках прарочага яруса не было [5, с. 903]. Аднак акрамя названых, да якіх звярталіся даследчыкі, нам вядомы і іншыя крыніцы XVI ст. з апісаннямі беларускіх іканастасаў. Гэта датычыцца дакументаў, прысвечаных Тураўскаму і Пінскаму саборам. Але і там у гэты перыяд іканастасы не мелі ў сваім складзе разглядаемага яруса [26, с. 185, 189].

У Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве захаваліся крыніцы канца XVI – пачатку XVII ст. з апісаннямі праваслаўных цэркваў Слуцка. З іх праўда не заўсёды можна зразумець склад іканастасаў (апісанні цэркваў Св. Варвары за 1571 г. і Св. Юрыя за 1604 г. [1, 3]), аднак у некаторых выпадках вынікае, што прарочага яруса там тады таксама не было (апісанні царквы Св. Іллі за 1575 і 1602 гг. [2, с. 4–6, 47–48]). Натуральна, што на падставе дзесятку храмаў нельга рабіць абагульняючыя высновы, аднак па ўсёй верагоднасці, да канца XVI ст. прарочы чын шырока не ўкараніўся ў беларускіх іканастасах.

Аднак практыка яго выкарыстання ў той час ужо была і ў нашым рэгіёне. Упершыню гэты ярус упамінаецца ў дакументах з апісанем Дабравешчанскай царквы Супрасльскага манастыра (зараз на тэрыторыі Польшчы), для якой у 1557 г. быў завершаны іканастас, які ўключаў і абразы Прарокаў [5, с. 903]. Гэта найбольш ранняя згадка пра гэты ярус, які, відавочна, у той перыяд на нашых землях быў новаўвядзеннем. Напэўна, больш шырока абразы Прарокаў пачынаюць выкарыстоўвацца для іканастасаў толькі ў самым канцы

XVI – XVII ст. Распаўсюджанне гэтай з'явы акурат прыпала на часы Уніі на землях Вялікага Княства Літоўскага. Аднак на нашую думку, прарочы ярус у іканастасах і праваслаўных, і ўніяцкіх цэркваў нашых земляў пачынае выкарыстоўвацца адначасова. З чым было звязана яго ўзнікненне ў гэты перыяд, сказаць даволі складана. Магчыма, Супрасльскі манастыр, як адзін з буйных духоўных асяродкаў таго часу, «дыктаваў моду».

Але ўжо у сярэдзіне ХУІІ ст. вядома некалькі прыкладаў існавання Прарочага чыну ў беларускіх іканастасах (і ўніяцкіх, і праваслаўных). Так, у 1640-ыя гг. быў заказаны новы іканастас для згаданай супрасльскай царквы, якая ў гэты перыяд ужо была грэка-каталіцкай [10, с. 39]. Дадзены помнік, як і папярэдні комплекс XVI ст., не захаваўся да нашага часу, аднак уяўленне пра яго даюць здымкі пачатку ХХ ст. [18]. На іх добра бачна, што ў верхім ярусе па цэнтры знаходзіцца ікона «Хрыстос Архірэй», а паабапал ад яе размешчаны па дзве іконы Прарокаў, на якіх скампанаваны па тры персоны. Такім чынам, у дадзеным ярусе былі прадстаўлены 12 Прарокаў.

Аўтарства гэтага помніка (маецца на ўвазе яго канструкцыя і разьбяныя дэталі), выкананага, верагодна, у пачатку 1640-х гг., да нядаўняга часу прыпісвалася гданьскаму разьбяру Анджэю Мадзалеўскаму. Аднак нядаўна польская даследчыца Я. Тамальска апублікавала вынік сваіх навуковых росшукаў, адкуль вынікае, што аўтарам канструкцыі з'яўляўся невядомы разьбяр з Вільні, а абразы напісаў жывапісец Вінцэнт адтуль жа. А Анджэй Мадзалеўскі, на яе думку, быў не гданьскім, а віленскім майстрам і яго праца заключалася ў залачэнні іканастаса [10, с. 39]. З усіх уніяцкіх іканастасаў, выгляд якіх вядомы па захаваных помніках або іканаграфічных крыніцах, супрасльскі комплекс з'яўляецца самым старым.

А вось сярод спадчыны, якая дайшла да нашага часу, найбольш старажытным з'яўляецца іканастас Успенскага сабора Жыровіцкага манастыра. Гэты комплекс – адзіны высокі драўляны ўніяцкі іканастас на Беларусі, які захаваўся да цяперашняга часу на сваім месцы, у сваёй будове, і амаль з поўным складам аўтэнтычных абразоў (у ніжнім ярусе першасныя абразы былі заменены ў сярэдзіне XIX ст., калі манастыр, пасля скасавання Уніі, быў пераведзены ў праваслаўе) [33, с. 115]. Зараз іконы верхніх двух ярусаў – апостальскага дэісуса

і прарочага – захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (далей – НММ РБ) [12, с. 15–22]. Да нядаўняга часу адносна перыяду выканання гэтага аб'екта выказваліся розныя версіі. Паводле адной з іх, якая належыць польскаму даследчыку В. Баберскаму, дадзены помнік быў зроблены ў 1732–1733 гг. [11]. Прапанаваная ім дата фігуруе ў анатацыях да абразоў пры іх апублікаванні ў каталогах і буклетах [12, с. 15–22]. Аднак беларускі мастацтвазнавец А.А. Ярашэвіч аспрэчваў гэтыя дадзеныя і выказваў меркаванне, што жыровіцкі іканастас быў створаны раней, магчыма нават у канцы XVII ст. [33].

Нам, дзякуючы вельмі каштоўнай знаходцы, удалося праліць святло на час стварэння іканастаснай структуры. Так, у канцы 2016 г. намі ў архіве Санкт-Пецярбургскага інстытута гісторыі Расійскай акадэміі навук быў адшуканы унікальны дакумент, з якога вынікае, што разглядаемы помнік быў выкананы па заказе маршалка Аляксандра Гілярыя Палубінскага ў 1676 г. майстрам-разьбяром Янам Радванскім [30, арк. 21 адв.]. Гаворка, натуральна, вядзецца пра саму канструкцыю, аднак відавочна, што і абразы, сярод якіх і іконы прарочага чыну, былі напісаны прыблізна ў той жа час, а таму іх можна датаваць, калі не 1676 г., то хаця б апошняй чвэрцю XVII ст.

У разглядаемым ярусе знаходзяцца тры абразы: два з парнымі выявамі Прарокаў і цэнтральны – з выявай «З'яўленне абраза Божай Маці Жыровіцкай». Усе тры іконы напісаны алейнымі фарбамі на дошцы. На двух парных абразах з разглядаемага яруса прадстаўлены вялікія прарокі – Ісая і Іерамія *(іл. 1)*, Эзэкіль і Данііл. Паводле канону ў іх адлюстраванні, яны паўстаюць са скруткамі ў руках, на якіх напісаны словы прароцтваў. Паміж гэтымі іконамі размяшчаўся цэнтральны абраз прарочага яруса – «З'яўленне абраза Божай Маці Жыровіцкай». Звычайна ў іншых выпадках цэнтральнае месца ў разглядаемым ярусе займала ікона «Божая Маці Прадвесце», прыклады чаго вядомы па апісаннях у гістарычных дакументах і па некаторых захаваных помніках. Аднак у дадзенай сітуацыі замест такой іконы была змешчана іншая, сюжэт якой ілюструе эпізод з гісторыі цудадзейнага абраза Божай Маці Жыровіцкай, калі яна ў прамяністым зз'янні паказалася на дрэве *(іл. 2)*.



*Іл. 1. Абраз «Прарокі Ісая і Іерамія», 1676 (?), паходзіць з сабора Успення Божай Маці жыровіцкага манастыра, Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. Дошка, алей. Захоўваецца ў НММ РБ. Фота Дз. Казлова*



*Іл. 2. Абраз «З'яўленне абраза Божай Маці Жыровіцкай», 1676 (?), паходзіць з сабора Успення Божай Маці жыровіцкага манастыра, Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. Дошка, алей. Захоўваецца ў НММ РБ. Фота Дз. Казлова*

Такім чынам, два прыведзеныя прыклады сведчаць пра тое, што ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. у храмах базыльянскіх кляштараў пачынаюць паўставаць іканастасы з прарочым ярусам. На 1704 г., а гэта самая ранняя вядомая нам крыніца, якая змяшчае пратаколы праверак грэка-каталіцкіх манастыроў, акрамя супрасльскага і жыровіцкага, іканастасы з прарочым чынам былі ў цэрквах Ружанскага (царква Св. Апосталаў Пятра і Паўла), Быценскага (царква Спаса) кляштараў [31, арк. 61 адв., 64]. Пры чым у апошнім іканастас згадваецца як стары. Не вядома, калі ён быў зроблены, аднак для параўнання адзначым, што жыровіцкі іканастас, які на гэты час меў 30 гадоў, у гэтай жа крыніцы апісваецца як «прыгожы і багаты» [31, арк. 12–13]. Такія характарыстыкі маглі ўжывацца толькі да новага комплекса. Таму атрымліваецца, што ўзрост у 30 гадоў для такога важнага сакральнага аб'екта лічыўся нязначным. Верагодна,

што «стары» быценскі іканастас быў усталяваны ў першай палове XVII ст., а можа і раней.

Што датычыцца тагачасных прыхадскіх цэркваў, то пра ўкараненне там гэтай традыцыі ў названы прамежак часу меркаваць досыць складана. Справа ў тым, што найбольш раннія дакументы з апісаннямі беларускіх уніяцкіх храмаў, якія належаць да 1680–1690-х гг., не даюць дакладнай інфармацыі пра склад і структуру іканастасаў: там, як правіла, толькі канстатуецца наяўнасць ці адсутнасць іканастаса (у гэты час у грэка-каталіцкіх цэрквах назіралася варыятыўнасць у фарміраванні сакральных інтэр’ераў) [14, 29]. Фактычна, самыя старыя крыніцы, з якіх усё ж можна атрымаць інфармацыю пра праграму ўніяцкіх іканастасаў прыхадскіх цэркваў, датуюцца другой чвэрцю XVIII ст.

Так, з візітаў шэрагу цэркваў Брэсцкага афіцыялату Уладзіміра-Брэсцкай епархіі за 1725–1727 гг., вынікае, што ў гэты час у названым рэгіёне іканастасы з прарочым чынам таксама існавалі, праўда пераважалі тут, у адрозненні ад Мсціслаўскага афіцыялату Полацкай епархіі, усё ж комплексы ў адзін-два чыны [4]. У трох’ярусных іканастасах прарочы рад быў верхнім над мясцовым і дэісусным ярусамі. У больш познія перыяды ў іншых рэгіёнах зафіксаваны чатырох’ і пяціярусныя іканастасы, у складзе якіх амаль заўсёды (за выключэннем адзінкавых выпадкаў) быў разглядаемы чын [24, 25].

Другім аспектам, які неабходна разгледзець, з’яўляецца пытанне пра сюжэтную праграму гэтага яруса. Зноў-такі, па адзінкавых захаваных іканастасах і рэдкіх асобных іконах меркаваць даволі складана. Аднак з дапамогай архіўных крыніц усё ж можна праліць пэўнае святло. Праўда ў шэрагу дакументаў дакладна не гаворыцца, колькі ў гэтым чыне было абразоў, ніколі не адзначаецца, хто менавіта на іх прадстаўлены.

Апісаныя вышэй супрасльскі і жыровіцкі іканастасы сведчаць пра тое, што склад прарочага чыну мог быць неаднолькавым. Па-першае, цэнтральная выява гэтага яруса магла мець розны сюжэт, прыкладамі чаго з’яўляюцца згаданыя вышэй іканастасы з супрасльскай і жыровіцкай цэркваў. У візітах цэркваў Мсціслаўскага афіцыялату за 1732–1736 гг. даволі часта адзначаецца наяўнасць іконы Божай Маці [28, арк. 26 адв., 30]. Якая менавіта іканаграфія была ў гэтых творах, з названай крыніцы незразумела. Аднак у візітах цэркваў

Турава-Пінскай епархіі за 1777 г. цэнтральны абраз паміж Пракамі, як правіла, апісваецца наступным чынам: «obraz Matki Nayswiętszey wcielenie syna Bożego wyobrazaiącego» [24, арк. 15 адв.]. Гэта дазваляе выказаць думку, што гаворка ідзе пра выяву іканаграфічнага тыпу «Божая Маці Прадвесце».

Да цяперашняга часу твораў з такой выявай захаваліся адзінкі. Да іх ліку належыць помнік з царквы г.п. Шарашова Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Іконы з выявамі Прарокаў у гэтай царкве не захаваліся. Аднак з архіўных крыніц вядома, што ў пэўны прамежак часу прарочы чын у іканастасе названага храма ўсё ж быў. Пазней пры перафарміраванні іканастаса ў XIX ст. абразы Прарокаў былі прыбраны, а цэнтральная ікона з выявай «Божая Маці Прадвесце» была перамешчана ў цэнтр святочнага яруса [24, с. 156].

Што датычыцца ўвогуле абразоў Прарокаў уніяцкага паходжання, то іх захавалася вельмі мала (праваслаўных таксама). Аднак і гэтыя адзінкавыя творы сведчаць пра тое, што сюжэтна-тэматычны рэпертуар гэтага яруса мог быць даволі разнастайным. Напрыклад, маглі быць у ярусе прадстаўлены чатыры вялікія Прарокі, як у жыровіцкім цыкле, а маглі быць увасоблены 12 малых Прарокаў. Таксама маглі прысутнічаць у гэтым ярусе акрамя Прарокаў выявы і Праайцоў, што даволі часта і адбывалася. Увогуле, як слушна адзначыў А. А. Ярашэвіч, для беларускіх іканастасаў (і праваслаўных, і ўніяцкіх) уласціва адсутнасць асобнага праайцоўскага чыну, а выявы Праайцоў часта былі змешчаны ў агульным ярусе з Прарокамі [34].

Прыкладам гэтаму з'яўляюцца некаторыя захаваныя помнікі. Паводле звестак аўтараў калектыўнай манаграфіі «Іканапіс Заходняга Палесся XV–XIX ст.» у адным з храмаў Драгічынскага раёна [20, с. 248, іл. 82], відавочна, хоць гэта ў выданні і не пазначана, гаворка вядзецца пра царкву Уваскрасення Божага ў Антопалі [32, с. 174], захоўваюцца тры парныя абразы Прарокаў, якія ў названы храм былі перададзены з в. Зёлава Кобрынскага раёна. З іх у кнізе быў апублікаваны толькі адзін. Акрамя таго, з зёлаўскай царквы некалькі абразоў захоўваецца ў НММ РБ, сярод якіх ёсць і помнік з парнай выявай Прарокаў. Такім чынам, вядомы дзве апублікаваныя прарочыя іконы з аднаго іканастаса.

Персанажы на адным з двух зёлаўскіх абразоў, якія зараз захоўваецца ў НММ РБ, вызначаны як Маісей і Даніїл [19, іл. 128]. Другі ж

абраз, які цяпер знаходзіцца ў антопальскай царкве, пры публікаванні быў падпісаны проста як «Прарокі» [20, с. 248]. На нашую ж думку, на гэтым творы прадстаўлены Давід (у кароне, з барадой) і Аарон (з лілеяй у руцэ).

У выданнях пры друку гэтых абразоў да іх была пазначана прыблізная дата – другая палова XVIII ст. На нашую думку, дадзеныя абразы пісаліся ў 1720–1750-ыя гг. Выказаць такую версію дазваляе тая акалічнасць, што ў іншым храме гэтага ж рэгіёну захаваўся падпісаны абраз «Юрый-Змеяборац», на якім пазначана дата 1729 г. [20, с. 195]. Стылістычна ён падобны да групы зёлаўскіх абразоў, а таксама ікон з царквы ў в. Андронава Кобрынскага раёна, што дае магчымасць казаць пра дзейнасць у гэтым рэгіёне майстра (або суполкі майстроў), які выконваў творы ў характэрнай манеры. Усе гэты абразы звяртаюць на сябе ўвагу матывам разьбянога малюнку па ляўкасу, які сфарміраваны завіткамі сцяблін з кветкамі лілеі.

На жаль, нам не ўдалося знайсці крыніцы XVIII ст. з апісаннем інтэр'еру зёлаўскай царквы. У дакуменце за 1837 г., калі вялася падрыхтоўка да скасавання Уніі, пра царкву ў Зёлаве адзначаецца, што іканастас у ёй усталяваны «у апошнія гады» [6, арк. 5 адв.]. Пад гэтым выразам маюцца на ўвазе, відавочна, 1834–1836 гг., бо менавіта ў гэты перыяд храмы пераабсталёўваліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі ўсходняга абраду: знішчаліся прысценныя алтары, арганы, амбоны, лаўкі; ставіліся іканастасы. Аднак гэта не азначае, што тады былі напісаны іканастасныя абразы. Справа ў тым, што працэс пераабсталявання інтэр'ераў праводзіўся хутка, таму даволі часта іканастасы рабіліся «на хуткую руку», для чаго выкарыстоўваліся і старыя абразы, якія знаходзіліся ў царкве ад колішніх іканастасаў.

У Музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (далей МСБК) захоўваецца абраз, які, відавочна, паходзіць з прарочага чыну іканастаса – «Прарок Аарон» у картушы. У названую ўстанову ён патрапіў з царквы в. Мышчыцы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці [22]. Каб высветліць штосьці пра гісторыю твора, мы звярнуліся да гістарычных крыніц, з якіх вынікае, што да 1802 г. (візіты Кобрынскага дэканата за 1759, 1784, 1802 г.) у названым храме іканастаса не было [7, с. 110-111; 8, арк. 25 адв.; 9, арк. 37–37 адв.]. Аднак па суседстве

знаходзілася царква ў в. Чаравачыцы, дзе ў 1802 г. быў іканастас з прарочым чынам, выкананым на дошках [9, арк. 33–33 адв.].

Неабходна адзначыць, што на 1802 г. на ўвесь Кобрынскі дэканат (а храмы гэтай царкоўна-адміністрацыйнай адзінкі мы разглядаем па той прычыне, што яны з'яўляюцца найбольш набліжанымі да мышчыцкай царквы, а таму магчыма, што з нейкай з іх быў перададзены іканастасны абраз Прарока Аарона) іканастас з прарочым ярусам быў толькі ў згаданых Чаравачыцах і ў Тэўлях, аднак у апошняй Прарокі былі напісаны на палатне [9, арк. 57 адв.]. Такім чынам, найбольш верагодна, што названы твор паходзіць з Чаравачыцаў. Можна выказаць і пэўныя думкі наконт даты стварэння гэтага твора: на 1759 г. у Чаравачыцах іканастас быў аднаярусны [7, с. 106–107], у вядомай нам візіце Кобрынскага дэканата за 1784 г. царква ў гэтым паселішчы не згадваецца [8], а вось у дакументах за 1802 г. упамінаецца іканастас з прарочым ярусам [9, арк. 33 адв.]. Магчыма, што пасля 1784 г. быў узведзены новы царкоўны будынак, для якога і быў змайстраваны іканастас, апісаны ў крыніцы 1802 г.

У МСБК таксама захоўваецца комплекс абразоў з в. Бездзеж Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці (чатыры абразы з выявамі 12 Апосталаў, чатыры абразы з выявамі васьмі Прарокаў) [23] *(іл. 3-4)*. У адрозненне ад ікон Апосталаў з гэтага іканастаса, творы з прарочага чыну ніколі не публікаваліся і з'яўляюцца не ўведзенымі ў навуковае карыстанне. На жаль, нам не вядомыя гістарычныя крыніцы з апісаннямі дадзенага храма, аднак у згаданым вышэй дакуменце за 1837 г., у якім сістэматызаваны звесткі пра пераабсталяванне ўніяцкіх цэркваў Літоўскай епархіі, пра іканастас бездзежскай царквы гаворыцца, што ён «находился издревле» [6, арк. 6адв.], а гэта сапраўды дазваляе схіліцца да думкі, што разглядаемыя абразы былі выкананы не пазней за самы пачатак XIX ст.

Да ліку апублікаваных твораў належыць помнік з в. Данілавічы Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці [17, іл. 90]. Аднак, на жаль, не магчыма на дадзены момант вызначыць яго канфесійную прыналежнасць. Вядома, што царква, адкуль паступіў абраз, была пабудавана ў 1926 г. [21, с. 311]. Трэба адзначыць, што яна ўзведзена на месцы больш старога храма, які, аднак быў заснаваны недзе ў сярэдзіне XIX ст. Але ці быў там храм у часы Уніі, звестак няма. Справа ў тым, што ў апісаннях уніяцкіх



*Іл. 3-4 – Абразы Прарокаў, канец XVIII – пачатак XIX ст.,*
*паходзяць з царквы в. Бездзеж Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.*
*Захоўваюцца ў МСБК. Палатно, алей.*
*Фота М. Мельнікава*

цэркваў гэтага рэгіёну ў дакументах XVIII – першай паловы XIX ст. такі прыход не згадваецца. Магчыма, у той час у названым паселішчы храм быў праваслаўным, цалкым верагодна і тое, што там увогуле не было прыхода. У гэтым выпадку напрошваецца думка, што, паводле даволі распаўсюджанай практыкі, пасля ўзвядзення царквы туды быў перададзены стары іканастас з нейкага суседняга храма. На выяве прадстаўлены Прарокі Захарыя і Елісей, праайцы Іакаў, Елон і Аарон, цар Саламон, што сведчыць, зноў-такі, пра спалучэнне Прарокаў і Праайцоў у адным чыне [17, іл. 90].

Абагульняючы вышэй сказанае, трэба падкрэсліць, што, на матэрыяле гістарычных крыніц было ўстаноўлена, што ў 1730-ыя гг., паводле логікі тагачасных уніяцкіх візітатараў, поўным уніяцкім іканастасам лічыўся той, які складаўся з трох ярусаў: мясцовага, апостальскага дэісуса і прарочага. Гэта азначае, што да гэтага часу практыка выкарыстання такіх іканастасаў настолькі ўкаранілася, што ўспрымалася натуральнай і традыцыйнай, а пра адыход ад яе часам у тагачасных дакументах нават рабіўся адпаведны запіс.

На жаль, дакладных звестак пра перыяд пашырэння у беларускіх храмах іканастасаў менавіта такога складу і праграмы няма. Пасля першага вядомага прыкладу ўсталявання іканастаса з прарочым ярусам – у Дабравешчанскай царкве г. Супрасля у 1557 г. – верагодна, прайшло недзе паўстагоддзя, пакуль гэтая з’ява ўкаранілася. Пры чым адбылося гэта аднячасова і для праваслаўных, і для ўніяцкіх цэркваў. Найбольшая колькасць прыкладаў іканастасаў з Прарочым чынам зафіксавана ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі. Уніяцкія храмы ж цэнтральных рэгіёнаў у гэты перыяд былі абсталяваны пераважна на лацінскі лад: іканастасаў не мелі. А на Захадзе пераважалі нізкія (у адзін-два ярусы) іканастасы, але часам там таксама сустракаліся і трох’ярусныя. Большасць жа абразоў Прарокаў, якая дайшла да нашага часу, паходзіць усё ж з заходніх рэгіёнаў Беларусі.

Ад некалі шматлікай грэка-каталіцкай спадчыны захаваліся адзінкавыя помнікі, якія і былі прааналізаваны ў дадзеным артыкуле. Наколькі нам вядома, у музейных зборах краіны абразоў з прарочых чыноў уніяцкіх іканастасаў, акрамя разгледжаных вышэй, болей няма. Ёсць толькі помнікі другой паловы XIX ст., якія з’яўляюцца спадчынай праваслаўных цэркваў. У дзеючых храмах краіны, магчыма, і захаваліся іконы прарочага чыну ўніяцкіх іканастасаў, аднак, на колькі нам вядома, нават пад час шматлікіх экспедыцый, здзейсненых супрацоўнікамі

Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, такія творы, за выключэннем згаданых, выяўлены не былі.

У выніку праведзенага даследавання была ўстаноўлена дата стварэння і аўтарства канструкцыі жыровіцкага іканастаса – майстар Ян Радванскі, 1676 г. На жаль, звесткі пра выканаўцу абразоў пакуль адшукаць не ўдалося, аднак выяўленыя матэрыялы дазваляюць удакладніць перыяд напісання ікон: так, яны, відавочна, былі створаны не ў 1730-ыя гг., як меркавалася дагэтуль, а на паўстагоддзі раней – у канцы XVII ст. (а можа і ў 1676 г.). Выкарыстаныя намі для даследавання гістарычныя крыніцы дазволілі ўнесці ўдакладненні і ў датаванне абразоў з вёсак Зёлава, Бездзеж і Мышчыцы на Брэстчыне.


1. Archiwum główne akt dawnych w Warszawie. Archiwum Radziwiłłow (dalej – AGAD. AR). — Dz. VIII. — Nr. 527.
2. AGAD. AR. — Dz. VIII. — Nr. 536.
3. AGAD. AR. — Dz. VIII. — Nr. 537b.
4. Archiwum Państwowe w Lublinie. — Chełmski Konsystorz Greckokatolicki. — 101.
5. Janocha M. Ikonostasy w cerkwiach Rzeczypospolitey w XVII–XVIII wieku / M. Janocha // Przegląd Wschodni. — 2003. – T. VIII, z. 4 (32). — S. 897–921.
6. Lietuvos valstybes istorijos archyvas (dalej – LVIA). — Ф. 634, воп. 1, спр. 4.
7. LVIA. — Ф. 634, воп. 1, спр. 48.
8. LVIA. — Ф. 634, воп. 1, спр. 52.
9. LVIA. — Ф. 634, воп. 1, спр. 56.
10. Tomalska J. Uwagi na temat wyposażenia cerkwi Zwiastowania w Supraślu w XVI i XVII weku / J. Tomalska // Studia Podlaskie.— Białystok, 2012. — T. XX. — S. 27–53.
11. Баберскі В. Адзіны з шасці / В. Баберскі // Мастацтва. — 2005. — № 11. — С. 22–23.
12. Беларускі іканастас. Творы іканапісу і драўлянай пластыкі к. XVII – пач. XIX ст. / склад. А. Карпенка ; аўтар тэксту А. Ярашэвіч. — Мінск, 2015. — 52 с.
13. Ветер Э. И. Об особенностях белорусского иконостаса / Э. И. Ветер // Художественное наследие. Хранение, исследование, реставрация. — 1978. — № 4 (34). — С. 186–191.
14. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг. : зборнік дакументаў / укл. Д. Лісейчыкаў. — Мінск, 2009. — 270 с. : іл.
15. Гусакова В. О. Словарь русского религиозного искусства. Терминология и иконография / В. О. Гусакова. — СПб., 2012. — 280 с.
16. Духан И. Н. О программе и составе иконостасов Белоруссии XVII–XVIII вв. / И. Н. Духан // Советское славяноведение. — 1988. — № 2. — С. 70–84.

17. Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. — Мінск, 1980. — 17 с. : [164] арк. іл.
18. Институт истории материальной культуры РАН, фотоотдел архива. — О.385.16.
19. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. — Мінск, 2001. — 21 с. : [139] арк. іл.
20. Іканапіс Заходняга Палесся XV–XIX стст. / навук. рэд. В. Ф. Шматаў. — Мінск, 2002. — 349 с.
21. Кулагін А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. — Мінск, 2001. — 328 с. : іл.
22. Музей старажытнабеларускай культуры (далей – МСБК). — КП 92 (абраз Прарока Аарона, в. Мышчыцы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобласці, другая палова XVIII ст.; дошка, тэмпера).
23. МСБК. – КП 3681-3684 (абразы Прарокаў, в. Бездзеж Драгічынскага р-на Брэсцкай вобласці, першая палова XIX ст.; палатно, алей).
24. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). — Ф. 136, воп. 1, спр. 41240.
25. НГАБ. — Ф. 1781, воп. 26, спр. 1410.
26. Описи ризницы Турово-Пинской епископии (1585—1615 гг.) / падрыхтаваў і апрацаваў Ю. М. Мікульскі // Беларуская даўніна : гістарычны альманах. — 2015. – Вып. 2. — С. 179—201.
27. Православный мир. Образ Христа в иконографии стран Восточной Европы из музеев Беларуси, России, Сербии, Украины. К 1025-летию Крещения Руси / науч. ред. Е. В. Карпенко. — Минск, 2015. — 227 с.
28. Российский государственный исторический архив (далее – РГИА). — Ф. 823, оп. 3, д. 519.
29. РГИА. — Ф. 823, оп. 3, д. 420.
30. Санкт-Петербургский институт истории Российский академии наук (далее – СПбИИ РАН), архив. — Ф. 52, оп. 1, д. 164.
31. СПбИИ РАН, архив. — Ф. 52, оп. 1, д. 328.
32. Тэмперны жывапіс Беларусі XV–XVIII ст. у зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР : каталог / аўтар-склад. Н. Ф. Высоцкая. — Мінск, 1986. — 208 с.
33. Ярошевич А. А. Проблемы атрибуции иконостаса Успенского собора Жировичского монастыря / А. А. Ярошевич // XI Филевские чтения : тезисы конференции, 24–26 декабря 2012 года. — М., 2012. — С. 113–115.
34. Ярашэвіч А. А. Іканастас / А. А. Ярашэвіч // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / А. А. Ярашэвіч. — Мінск, 2001. — С. 126.